Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЛЮТАГА 2017 г. ЧАЦВЕР № 22 (28386)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Вялікая размова з Прэзідэнтам

Аляксандр Лукашэнка 3 лютага правядзе сустрэчу з прадстаўнікамі грамадскасці, беларускіх і замежных СМІ.

Мерапрыемства пройдзе ў пашыраным фармаце пад агульнай назвай «Вялікая размова з Прэзідэнтам», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. У ім прымуць удзел амаль чатыры дзясяткі журналістаў, якія прадстаўляюць найбольш вялікія дзяржаўныя і недзяржаўныя беларускія СМІ, папулярныя інтэрнэт-парталы, аўтарытэтныя замежныя масмедыя.

На сустрэчу запрошаны і шматлікія эксперты, сярод якіх вядомыя палітолагі, эканамісты, прадстаўнікі партый, канфесій і грамадскіх аб'яднанняў. Яны таксама прымуць удзел у дыялогу па найбольш актуальных тэмах.

Прамая трансляцыя сустрэчы кіраўніка дзяржавы з прадстаўнікамі грамадскасці і сродкаў масавай інфармацыі пачнецца ў 10 гадзін 3 лютага. Яна будзе весціся па тэлеканалах «Беларусь 1», «Беларусь 24» і Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Тэлеверсія сустрэчы будзе паказана ў вячэрнім эфіры беларускіх тэлеканалаў.

Шосты дзень — не лішні

Фота БЕЛТА.

Рэпетыцыя ўзорнага харэаграфічнага ансамбля «Данс Авеню».

Дзверы сталічнай гімназіі №5 у суботу практычна не зачыняюцца. Таму падпісаны нядаўна міністрам адукацыі загад аб арганізацыі шостага школьнага дня не стаў для ўстановы вялікай навіной. Тут і раней праводзіліся па суботах факультатыўныя заняткі, працавалі аб'яднанні па інтарэсах. Па суботах у гімназіі таксама праходзяць падтрымліваючыя і стымулюючыя заняткі, сустрэчы педагогаў з бацькамі.

Працяг тэмы на стар. 3.

ЦЫТАТА ДНЯ

Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтрвыбаркама:

«Падагульняючыя прапановы міжведамаснай экспертнай групы пры ЦВК носяць збалансаваны характар і адпавядаюць рэкамендацыям АБСЕ. Перш за ўсё, гаворка ідзе пра ўключэнне ў закон рэкамендацый Цэнтрвыбаркама, якія прымяняліся падчас парламенцкіх выбараў 2016 года. У тым ліку гэта рэйтынгавае галасаванне па складзе камісій, прысутнасць назіральнікаў пры іх утварэнні, празрысты падлік галасоў ва ўмовах, якія дазваляюць удзельнікам маніторынгу бесперашкодна выконваць свае абавязкі. Прапануецца таксама павялічыць тэрмін утварэння выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты і самі памеры фондаў, а таксама магчымасць узносаў з боку грамадзян і юрыдычных асоб».

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 17022>

■ За духоўнае адраджэнне

АСОБНА АД ЦЫВІЛІЗАЦЫІ І РАЗАМ З ЛЮДЗЬМІ

Размова з ігуменам пра сувязь манастыра і людзей, якія жывуць па-за яго сценамі

Ігумен Яўсевій (Цюхлоў), намеснік Свята-Елісееўскага Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра, сёлета стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». У адпаведным указе кіраўніка дзяржавы пазначана: «за асабісты ўклад у духоўна-маральнае і патрыятычнае выхаванне моладзі». «Звязда» неаднойчы пісала пра адроджаны на беразе Нёмана адзін з самых старажытных манастыроў Беларусі. Заснаваны ў XIII стагоддзі вялікімі літоўскімі князямі, ён у XIV—XVI стагоддзях быў духоўна-адукацыйным цэнтрам гэтых зямель. Пра што сведчаць летапісы, паданні і створанае ў яго сценах ілюстраванае рукапіснае Лаўрышаўскае Евангелле. У нашы дні манастыр адраджаецца і зноў становіцца месцам прыцягнення ўсё большай колькасці паломнікаў. Сюды едуць з розных куткоў Беларусі і іншых краін, каб знайсці духоўную дапамогу, суцяшэнне, параду, аднавіць душэўныя і фізічныя сілы. І ніхто не ад'язджае адсюль, не атрымаўшы патрэбнага.

СТАР. 13

■ Рынак жылля

У ЧАКАННІ ДРУГОЙ ХВАЛІ ПАТАННЕННЯ

На другасным рынку жыллёвай нерухомасці сталіцы эксперты прагназуюць далейшае зніжэнне цэн прыкладна на 7%

Увогуле, леташні сезон трапіў у разрад выключных адразу па некалькіх намінацыях. Толькі за адзін год былі зафіксаваны два рэкордныя за апошняе дзесяцігоддзе паказчыкі: першы датычыцца мінімальнага ўзроўню цэн, а другі — максімальнай колькасці праведзеных здзелак куплі-продажу.

Цэнавае дно №1

Паводле падлікаў спецыялістаў па нерухомасці, практычна ўсё першае паўгоддзе летась працягвалася распачатае яшчэ задоўга да гэтага зніжэнне цэннікаў. У выніку за студзень—май мінулага года цана квадратнага метра ў здзелках з кватэрамі стандартных спажывецкіх якасцяў знізілася на 13%. А агульнае зніжэнне яе за перыяд з кастрычніка 2014 (пачатку перыяду зніжэння) па май 2016 года склала 38% ці ў сярэднім — 620 долараў за «квадрат».

Намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Святлана Кудзелка адзначае, што мінімальны ўзровень цэн на сталічную нерухомасць быў дасягнуты летась у маі, калі квадратны метр кватэр у сярэднім апусціўся да 1 010 долараў, што стала рэкордам для апошніх 10 гадоў. Менавіта тады беспрэцэдэнтна нізкі кошт жылля ва ўсіх сегментах і з'яўленне на рынку кватэр за 28—30 тысяч долараў справакавалі выхад на рынак так званага адкладзенага попыту — тых пакупнікоў, хто альбо чакаў наступлення цэнавага дна, альбо проста фінансава не мог дазволіць сабе куплю кватэры.

СТАР. 4